графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якая пасля стала магутнай творчай асновай нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі.

У пасляваенны перыяд, сумяшчаючы з актыўнай творчай дзейнасцю, І. В. Ахрэмчык ажыццяўляў значную педагагічную працу ў Мінскім мастацкім вучылішчы (1948–1952), Беларускім політэхнічным інстытуце (1953–1963), Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1963–1971).

У гэты час творчасць І. В. Ахрэмчыка самым непасрэдным чынам суадносілася са стылявымі і стылеўтваральнымі напрамкамі ў выяўленчым мастацтве гэтай эпохі. З канца 1950-х гг. выяўленчае мастацтва і жывапіс перажывалі кардынальныя змяненні. Сведкам гэтых змен з'явіўся так званы «суровы стыль», які актыўна развіваўся ў тым перыядзе. Час запатрабаваў ад мастакоў паглыбленага асэнсавання суровых і драматычных бакоў рэчаіснасці, што найбольш грунтоўна выявілася ў звароце жывапісцаў да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, яе ўплыву на духоўны свет чалавека. І асобнае месца ў мастацтве займала творчасць і педагагічная дзейнасць народнага мастака Беларусі Івана Восіпавіча Ахрэмчыка.

1. *Аладова, Е. В.* И. О. Ахремчик / Е. В. Аладова. – М. : Сов. художник, 1960. – 55 с.

2. *Ваданосава, Ф.* Майстар партрэта Іван Ахрэмчык / Ф. Ваданосава // Роднае слова. – 1993. – № 12. – С. 32.

3. *Тараканава, М.* Партрэтны жывапіс Івана Ахрэмчыка: карціна «Якуб Колас і Янка Купала» / М. Тараканава // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С. 68–69.

УДК 7.046.1+398

***А. В. Шаціла,***
*старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

## СПЕЦЫФІКА ЎВАСАБЛЕННЯ МІФАЛАГІЧНЫХ ВОБРАЗАЎ У СУЧАСНЫМ МАСТАЦТВЕ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца спецыфіка ўвасаблення міфалагічных вобразаў у сучасным мастацтве. Аўтар адзначае, што міфала-

гічныя вобразы становяцца сродкам вызначэння асобы мастака ў сусвеце мастацкіх культур, дапамагаюць разумець сваё дачыненне да народа, гісторыі, культурнай традыцыі і з'яўляюцца важным фактарам ідэнтыфікацыі пры міжкультурнай камунікацыі. У выніку аўтар прыходзіць да высновы, што сучасныя мастакі не атаясамліваюць працэс стварэння з магічнай функцыяй захавання стабільнасці сістэмы, як гэта адбываецца ў міфалогіі, а хутчэй пераасэнсоўваюць міфалагічныя вобразы і ствараюць на іх аснове свае.
**Ключавыя словы:** арнамент, міф, міфалогія, міфалагічны вобраз, сімвал, знак, мастацкі вобраз, сучаснае мастацтва, народнае мастацтва, фальклор.

***E. Shatilo,***
*Senior Lecturer of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## SPECIFICITY OF PERFORMANCE OF MYTHOLOGICAL IMAGES IN MODERN ART

**Abstract.** The article examines the specifics of the embodiment of mythological images in modern art. The author notes that mythological images become a means of defining the artist's identity in the universe of artistic cultures, strive to understand one's relationship to the people, history, cultural tradition and are an important factor of identification in intercultural communication. As a result, the author comes to the conclusion that modern artists do not identify the process of creating a work with the magical function of preserving the stability of the system, as it happens in mythology, but rather reinterpret mythological images, create their images based on myths.
**Keywords:** ornament, myth, mythology, mythological image, symbol, sign, artistic image, modern art, folk art, folklore.

Увасабленне міфалагічных вобразаў у мастацтве характэрна для ўсяго чалавецтва. Нават у сучасным мастацтве мы бачым устойлівыя міфалагічныя вобразы, якія адлюстроўваюць тыя ці іншыя ўяўленні народа пра навакольны свет, яго будову і ўзаемадзеянні з чалавекам. Міфалагічныя вобразы могуць мяняць свае аблічча, яны рэалізоўваюцца ў розных кантэкстах, набываюць форму, замацоўваюцца ў традыцыі, а потым уключаюцца аўтарам у сферу мастацкай рэчаіснасці праз увасабленне ў творы. Менавіта так паўтараюцца легенды, становяцца ўстойлівымі вобразы і працягваюць сваё жыццё ў сучасным мас-

тацтве, а важныя надзённыя пытанні знаходзяць водгук у міфалагічных схемах і зноў нараджаюцца. Так, архетыпічныя матывы могуць бясконца ўвасабляцца і трансфармавацца праз міфалагічныя вобразы, адказваючы на патрабаванні часу.

Міфалагічны вобраз у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве больш схаваны, ён значна менш выяўленчы. Стагоддзямі ён захоўваўся ў арнаментах, рытмах, колерах, прадметах і заставаўся актуальным, таму што вырашаў задачы фарміравання структуры свету і стабільнасці яго існавання. Базавымі вобразамі можна назваць увасабленне прадстаўленняў пра светабудову, узаемасувязь частак і цэлага, узнаўленне працэсу стварэння свету і цыклаў. Таму адным з варыянтаў увасаблення міфалагічных вобразаў становіцца арнаментыка.

Шматлікія міфалагічныя ўяўленні захаваліся ў геаметрычных арнаментах народнага мастацтва. Сэнс такіх выяў, як крыжы, ромбы, кругі, хвалістыя лініі, забываўся, яны атрымлівалі шэраг новых значэнняў і дапаўнялі старыя, але працягвалі жыццё ў арнаментах да нашых часоў. Менавіта народнае мастацтва трансліруе ўяўленні пра светабудову і месца чалавека ў свеце і застаецца адзіным спосабам захавання і перадачы важнай этнакультурнай інфармацыі. Пры гэтым міфалагічныя вобразы можна надзяляць рознымі сімвалічнымі сэнсамі.

Арнамент прысутнічае ва ўсіх пластычных мастацтвах. Адны арнаментальныя элементы стагоддзямі заставаліся нязменнымі, а некаторыя змянялі форму, іншыя набывалі новы сэнс пры захаванні старой формы. Асобныя міфалагічныя вобразы, увасобленыя ў арнаментальных знаках, функцыянуюць як сімвалы, што перадаюць значную для этнасу інфармацыю ў прасторы і часе, становяцца важным фактарам ідэнтыфікацыі пры міжкультурнай камунікацыі. Міфалагічныя вобразы з’яўляюцца сродкам вызначэння асобы мастака ў сусвеце мастацкіх культур, дапамагаюць разумець сваё дачыненне да народа, гісторыі, культурнай традыцыі. Асновай для замацавання міфалагічнага вобраза лічыцца яго значнасць у соцыуме, трыгер, экзістэнцыяльны міф, які мае важнасць для этнасу.

Вобраз сонца як крыніцы, пачатку жыцця ўвасабляецца праз кропку, кола, круг. У ім канцэнтруецца некаторая колькасць сімвалаў. Гэта і сімвал бясконцасці руху, кропкі адліку, адначасова пачатку і канца. У геаметрычных варыянтах арнаменту круг ператвараецца ў ромб альбо крыж, у яго з’яўляюцца лініі-

промні. Так выражаюцца розныя салярныя знакі-сімвалы, агульныя для індаеўрапейскіх культур. Пазней сімвал сонца, якое нясе сэнс агню ці зоркі, можа ператварацца ў васьмі-канцовую зорку.

Менавіта ў салярнай сімволіцы добра бачны перанос сэнсаў сімвала для людзей розных гістарычных эпох. Калі для старажытнага чалавека такі салярны сімвал, як крыж з загнутымі промнямі, мае відавочны сэнс сонца, свету, руху сонца па небе, то для чалавека XXI стагоддзя ён набывае зусім іншае па сваім сэнсе і эмацыянальнай афарбоўцы значэнне (свастыка).

Зямля як вобраз маці-зямлі таксама прысутнічае ва ўсіх народаў свету. У геаметрычных арнаментах сімвал зямлі ўвасабляецца ў выглядзе квадрата, ромба, трохкутніка. У адрозненне ад знака сонца, лініі змяшчаюцца ўнутры ромба ці квадрата. Часта яны спалучаюцца ў складаныя па структуры кампазіцыі элементы, якія абазначаюць такія смежныя сінанімічныя паняцці, як сіла ўрадлівасці, крыніца жыцця, ураджай, дабрабыт.

Паколькі знакі арнаментыкі не з'яўляюцца знакамі алфавіта і ўвасабляюць вобразы ўмоўна, то знак зямлі, напрыклад, можна трактаваць як зямлю, поле, долю, Радзіму, а знак вады можа абазначаць дождж, раку, крыніцу. У розны час і ў розных народаў яны маглі абазначацца па-рознаму, пры гэтым інтуітыўна ідэнтыфікаваліся ў межах агульнага вызначэння сімвала. Для арнаментаў розных эпох і народаў характэрна розная ступень стылізацыі выявы і сэнсавага напаўнення сімвала. Кропка ў розных увасабленнях можа вызначаць пэўныя ўніверсальныя паняцці, напрыклад сонца, зямлю, зерне, ваду (дождж). Такім чынам захоўваецца інварыянтная структура сімвала пры розных варыянтах знака.

Арнаменты як увасабленні міфалагічных сімвалаў нясуць функцыю абагульнення і спрашчэння формаў, яны не толькі функцыянуюць ізалявана ў межах пэўнага сэнсу, але і складваюцца ў сістэмы, сэнсы якіх пашыраюцца і варыятыўна змяняюцца ў часе. Складанасць трактоўкі сэнсаў міфалагічных вобразаў падобна шматзначнасці тэксту. Сэнс знака, элемента арнаменту – гэта складаны комплекс, які ўключае схему-інварыянт, міфалагічны кантэкст, яго наяўнасць альбо адсутнасць, сімвалічны тэкст, калі ён увогуле ёсць. Пры гэтым знак таксама можа ўспрымацца не толькі як графічны малюнак, а

яшчэ і як колеравае спалучэнне, стаць архетыпічным матывам, альбо сімвалам у пэўным часе і быць ідэнтыфікатарам нацыі.

Для арнаментыкі характэрны даволі абстрактныя адносіны выявы і абазначанага прадмета. Пры гэтым інфармацыя, закладзеная ў міфалагічных вобразах і знаках, мае вялікую значнасць для этнасу. Аднак сучасныя мастакі страцілі магчымасць узнаўляць сэнсы праз аўтэнтычнае асяроддзе, часцей гэта адбываецца праз літаратурныя крыніцы. Для карэктнага разумення сэнсаў арнаментыкі, асабліва выкананай сучаснымі мастакамі, неабходна карэляцыя з самой выявай, яе кантэкстам існавання, гэта значыць з кантэкстам часу, асобай творцы і культурным асяродкам. Больш таго, для разумення сэнсаў заўсёды неабходна інфармацыя пра нейкую сукупнасць агульнавядомых несупярэчлівых базавых ведаў, якія складаюць культурны вопыт асобы. Народнае мастацтва, фальклор, традыцыі з'яўляюцца крыніцай міфалагічных вобразаў, але гэта не значыць, што міфы не могуць ствараецца ў сучаснасці.

Неабходнай умовай існавання міфалагічных вобразаў у сучасным мастацтве можна назваць наяўнасць стабільнай, агульнавядомай і агульназразумелай сістэмы для апісання свету, паколькі нярэдка з'яўляецца пытанне пра правільнасць трактоўкі і карэктнасць успрыняцця міфалагічных вобразаў. Свядомасць сучаснага чалавека адмаўляе аб'ектыўную рэальнасць міфаў, яго падзей. Пры гэтым яна прымае існаванне тых ці іншых персанажаў як аб'ектыўнае. Для асобы не з'яўляецца сутнасным, ці існавалі яны на самай справе, важны сам вобраз, бо ён становіцца бясконцай крыніцай натхнення для ўвасаблення міфа ў творы мастацтва. Так, міфалагічныя вобразы маюць прадметнае, матэрыяльнае існаванне, індывідуальны характар згодна з матэрыялам, стылем і асабістымі якасцямі мастака.

Такім чынам, у арнаментыцы розных народаў склалася ўстойлівая сістэма архетыпічных матываў і міфалагічных вобразаў, у той ці іншай ступені зразумелая для ўсіх.